# Гродзенскі след Максіма Багдановіча

*<u>Крыніца друкавання</u>*: Кузнячэнкава, Т. Гродзенскі след Максіма Багдановіча [Электронны рэсурс] / Таццяна Кузнячэнкава // Гродзенская праўда: [Сайт]. — Рэжым доступу: http://grodnonews.by/category/kul-tura/news29434.html. — Час доступу: 05.01.2017.

*9 снежня спаўняецца 125 гадоў з дня нараджэння аднаго з заснавальнікаў беларускай нацыянальнай мастацкай літаратуры, паэта, празаіка, гісторыка літаратуры і літаратурнага крытыка, публіцыста, перакладчыка Максіма Багдановіча.*

Ён нарадзіўся ў Мінску, жыў у Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, памёр у Ялце. Аднак, як падкрэсліваюць многія даследчыкі, менавіта дзіцячыя гады, праведзеныя ў Гродна, паспрыялі развіццю літаратурнага таленту паэта. Як іначай патлумачыць, што ва ўзросце 10 – 11 гадоў хлопчык, які жыў у Расіі, пісаў вершы па-беларуску?

Гродзенскі перыяд жыцця быў самым працяглым з таго, што Багдановіч правёў на Беларусі – амаль чатыры з паловай гады. Сюды сям’я пераехала, калі Максіму было восем месяцаў. Дом, дзе жылі Багдановічы, не захаваўся. Аднак у гродзенцаў і гасцей горада ёсць унікальная магчымасць перанесціся ў мінулае і завітаць у госці да сям’і будучага паэта: па вуліцы 1 Мая працуе музей Максіма Багдановіча, як яго і сёння называюць ды ведаюць. Афіцыйна гэта літаратурны аддзел Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Асаблівасць у тым, што гэта дом-музей. Тут не толькі створана экспазіцыя, якая распавядае пра жыццёвы і творчы лёс паэта, а ўзноўлена чатырохпакаёвая мемарыяльная кватэра.

*– Гэты дом тыповы для таго перыяду. Прыкладна такую кватэру, як мы бачым у музеі, магла здымаць сям’я дзяржаўнага служачага (кім і быў бацька Максіма – Адам Ягоравіч) канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Гэта гасцёўня, кабінет, дзіцячы пакой,* – распавядае загадчыца літаратурнага аддзела Алена Рапінчук.

Ёсць тут і асабістыя рэчы, якія належалі Багдановічу і яго сям’і: рамка для фотаздымкаў, сярэбраная лыжачка для гарбаты, фотаздымкі, асабістыя дакументы. Асаблівы гонар – шкатулка, якая належала маці паэта. І першы фотаздымак малога Максіма, зроблены ў 1892 годзе менавіта ў Гродне ў фотамайстэрні Садоўскага-Казлоўскага.

Каб пазнаёміцца з Багдановічам – паэтам, беларусам, грамадскім дзеячам, сябрам – у музеі распрацаваны шэраг экскурсій, у большасці якіх супрацоўнікі падышлі нетыпова і адмовіліся ад простага аповеду. Да прыкладу, дзецям дашкольнага ўзросту даспадобы музейныя заняткі “Максімаў домік” і “Старая кватэра” – дзякуючы акустычнаму абсталяванню і інфакіёску, на якім можна згуляць у камп’ютарную гульню, створаную на аснове экспазіцыі музея, і нават раздрукаваць паштоўку. Не так даўно з’явіўся новы музейны занятак “Вакол самавара”.

Для дарослай аўдыторыі таксама ёсць некалькі варыянтаў займальных экскурсій. Асабліва наведвальнікам падабаецца тэатралізаваная экскурсія “Марыя Апанасаўна запрашае” з праслухоўваннем урыўка з апавядання маці Максіма “Напярэдадні Каляд”, свецкімі гульнямі. Госці могуць пачаставацца зёлкавай гарбатай, а гаспадыня кватэры тым часам распавядзе пра лекавыя ўласцівасці зёлак і сакрэты іх ужывання.

Па меркаванні бацькі беларускага класіка Адама Ягоравіча, менавіта ад Марыі Апанасаўны сын атрымаў у спадчыну літаратурныя здольнасці, эмацыянальнасць і назіральнасць, вобразнасць мыслення. У 1896 годзе, пасля нараджэння дачкі Ніны, Марыя Апанасаўна захварэла на туберкулёз. Яе не стала ў кастрычніку таго ж года. Пахавана маці паэта ў Гродне на праваслаўных могілках па вуліцы Антонава. Дзякуючы дакладнаму апісанню, якое пакінуў Адам Ягоравіч, удалося знайсці магілу Марыі Апанасаўны. Пазней на ёй быў устаноўлены помнік.

Неўзабаве сям’я пераязджае з Гродна ў Ніжні Ноўгарад. Аднак рускамоўнае асяроддзе не перакрэсліла беларускага дзяцінства: Максім Багдановіч вывучае беларускую мову, піша на ёй, робіць пераклады.

Свой талент творца ахвяраваў роднай і бязмерна любімай Беларусі.